**Ксенія Макарава**

# Працяг Жыцця!

Спытай у любога чалавека: «Хочаш быць неўміручым і ніколі не глядзець смерці ў вочы?” – і ён, не задумваючыся, адкажа станоўча і нават падумае, што ты вар’ят, калі не разумееш відавочных рэчаў. “Гэта ж рытарычнае пытанне”, – адкажа незнаёмец. Сапраўды, хто ж не хоча жыць вечна? Ні болю, ні хвароб, ні страт…

Аднак не спяшайся, чалавеча… Не рабі заўчасных вынікаў. Не ўсё так проста, як здаецца. Вось і пан Заяц, пра-пра-пра…-дзед апавядальніка, ці Дзіда-дзед, галоўны герой алегарычнай казкі Змітрака Бядулі “Сярэбраная табакерка”, быў у гэтым упэўнены, пакуль не сустрэўся са Смерцю і не зняволіў яе, пасадзіўшы, дзякуючы выпадку, у табакерку. Апынуўшыся ў металічнай турме, хоць і з каштоўнага матэрыялу, смерць ірвецца на свабоду. Упрошвае, залагоджвае, ідзе на хітрыкі і нават шантаж. Не хоча сядзець у клетцы, хай сабе і сярэбранай. Крыві прагне. Чалавечых ахвяр. Стогнаў. Енкаў. Болю. Бо імя ёй Смерць. Хітраваты, разумны і смелы прашчур разумее памкненні Хударлявай, але выпусціць не згаджаецца. Сухарэбрая спыняе свае просьбы, бо разумее, што сумленны пан Заяц (як і чалавек) ніколі не пойдзе на кампрамісы са Смерцю. Цікава яшчэ, што зайцы і жывуць як людзі: нюхаюць табаку, гэтак жа апранаюцца, капаюць бульбу, ходзяць у школу, парацца ў лазні і сябруюць з людзьмі.

Кожны чытач упэўнены: людзі і звяры павінны ў пояс кланяцца Дзіда-дзеду-збавіцелю за выратаванне ўсяго чалавецтва. Але што мы бачым? Адны не задаволены тым, што Смерць забрала іх родных раней і прымушаюць Зайца вярнуць ім жыцці, бо, на іх думку, ён валодае надзвычайнымі здольнасцямі. Другія чакаюць вызвалення Смерці. Напрыклад, драпежнікі застануцца без ежы, а ім мяса хочацца, а не вадзічкі дажджавой, не жадаюць, як каровы, травою харцавацца. Суддзі, адвакаты, пракуроры, следчыя пазбавяцца крымінальных спраў і будуць “пасвіць камароў на балоце”. Разбойнікі, галаварэзы, шпіёны, міністры, каты, мяснікі ў сувязі з запаланеннем Смерці страцяць “усю пышнасць і бляск” сваіх прафесій. Вайсковыя начальнікі, як і фабрыканты вайсковай зброі, таксама застануцца без работы, бо вайна страціць сэнс. Дзеці багатых бацькоў, цароў і каралёў дзякуючы зайцу застануцца без спадчыны. Будуць галадаць папы, ксяндзы, манахі і яшчэ многа хто… А ўсяго іх некалькі мільёнаў! Аднак жа мы разумеем: не сабе жадаюць яны смерці! Іншым. Карыслівасць і зайздрасць раздзіраюць іхняе нутро. Дзіда-дзед не быў да гэтага гатовы, але не спужаўся. Перастрахоўваючыся, яго сябры Саўка і Юрка робяць некалькі падробак ўжо сусветна вядомай табакеркі.

Адна з іх і трапляе ў рукі (ці, дакладней кажучы, крылы) пані Сарачынскай, мясцовай сарокі. Наогул, вобраз Сарокі як сінонім слова смерць у фальклорных творах не новы. Напрыклад, вядома, што сарока – разносчыца навін, яе стракатанне абяцае прыбыццё гасцей, прадказвае нейкае здарэнне і нават смерць. Варта толькі ўспомніць Белую Сароку ў фантастычнай кнізе майго земляка Я. Баршчэўскага “Шляхціц Завальня…”, блізка з якой пазнаёмілася зусім нядаўна. Белая сарока – гэта жанчына-птушка, якая з’яўляецца дэманічнай істотай і нясе заняпад і бязладдзе. Баршчэўскі выкарыстаў дваістыя ўяўленні пра сароку, але ў той жа час стварыў вобраз арыгінальны і нават загадкавы. Змітрок Бядуля не быў амбівалентным, ствараючы вобраз Сарокі. У яго яна атаясамліваецца выключна са злом. Прагнучы ўсеагульнай улады, яна выношвае план помсты, у адпаведнасці з якім Смерць будзе ёй прыслугоўваць, знаходзячыся на залатым ланцугу ў выглядзе чорнага сабакі, вобраз якога, правадыра ў замагільны свет, таксама сустракаецца ў апавяданні Баршчэўскага “Вужыная карона”, знаёмы мне з 5 класа. Усе адмоўныя персанажы твора былі пакараныя, а людзі шчырыя і бескарыслівыя, што захавалі чысціню душы, вядома, узнагароджаны.

Але, на жаль, у канцы твора Смерць вырываецца на свабоду.

Вельмі мне захацелася зрабіць працяг казкі насамрэч казачным. І вось што я прыдумала…

Страшная навіна разнеслася па лесе: Смерць на волі. Гора ўсяму жывому! Самыя розныя людзі і жывёлы ў пошуках Смерці аказаліся ў самых розных кутках свету. Некаторым шанцавала падысці зусім блізка і паспрабаваць схапіць яе за хвост. Але ні ў кога так і не атрымалася. А Смерць ва ўсіх сваіх праявах аказвалася на крок раней. Вызваліўшыся з палону, яна стала намнога разумнейшай. І людзі страцілі надзею, стаптаўшы дзясяткі ботаў. І жывёлы стаміліся, абадраўшы лапы да крыві. А тым часам Смерць наганяла страчанае. Словы праклёнаў сыпаліся ад матак, што не дачакаліся з вайны сыноў, ад дзяўчат, што пахавалі каханне, ад дзяцей, што засталіся без бацькоў, ад салдат, што заглядвалі апошні раз у вочы сваіх таварышаў. А яна смяялася. А яна балявала на касцях. Так цягнулася амаль пяць гадоў. Кожны чацверты быў мёртвы… За пяць гадоў несупыннай працы Смерць змарылася, яшчэ больш схуднела і вырашыла папесціць сябе адпачынкам. Якраз надарыўся май. Вясна. Цеплыня. Смерць таксама цеплыню любіць. Пад разлапістым дубам заснула, а прачнулася ад песні. На ўзгорку зацягваў песню юнак, ды так меладычна, што захацелася Сухарэбрай бліжэй падысці, словы пачуць. Здаля пабачыў яе Костусь (так звалі хлапчука), адразу скеміў, хто да яго крадзецца, бо не раз чуў ад дзеда гісторыі пра яе жахлівае аблічча. Не здрыгануўся голас, не перапынілася песня. Дачакаўся юнак, калі бліжэй падыдзе Смерць і закрые вочы ад задавальнення, страціць пачуццё рэальнасці. Адзіным, што з сабою меў

хлопец, каб зняволіць Смерць, была кніга, якую гартаў на прыродзе. Так і аказалася яна закутай у вялізнай кнізе. Дзе цяпер тая Кніга? Хто ведае… Аднак галоўнае, што сустракаецца Смерць толькі ў аповесцях, апавяданнях, раманах, вершах і зусім рэдка ў казках. Жыццё працягваецца!